

*Прывітанне,*



*Я так разумею, што Вы разам з кіраўніцтвам краіны парушаеце правы чалавека. Мне падаецца, гэта вельмі кепска. Шкада, калі Вас не навучылі правам чалавека ў школе. Я лічу, паважаць такія правы, як, напрыклад, свабода сходаў, асацыяцыі і слова – гэта вельмі важна. Калі Вы будзеце і далей парушаць гэтыя правы, то ніколі не даведаецеся, што насамрэч думаюць грамадзяне ў Вашай краіне.*

*Таму я магу дапамагчы Вам даведацца пра правы чалавека больш. Хоць я толькі цацачны мядзьведзік, я іх разумею вельмі добра. Вось, напрыклад, два артыкулы з дэкларацыі ААН:*

- *"Кожны чалавек мае права на свабоду перакананняў і на іх свабоднае выражэнне; гэтае права ўключае свабоду бесперашкодна прытрымлівацца сваіх перакананняў і свабоду шукаць, атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю і ідэі любымі сродкамі і незалежна ад дзяржаўных межаў". (А Вы, напэўна, самі ведаеце, што ў Беларусі гэтае права насамрэч не дзейнічае. Як кепска!)*



- *"Кожны чалавек мае права на свабоду мірных сходаў і аб'яднанняў. Ніхто не павінен прымушацца ўступаць у якоесьці аб'яднанне". (Гэта завецца свабодай сходаў і асацыяцыі. У Вас да гэтага няма ніякай павагі.)*



*І я не толькі добра разумею дэкларацыі ААН – але магу і добра сціснуць у абдымках. Памойму, абдымкі памагаюць чалавеку падабрэць. Калі ласка, паспрабуйце мяне пацiскаць!*

*А калі Вы зробіцеся дабрэйшым і будзеце дзейнічаць ЗА правы чалавека, а не СУПРАЦЬ, мы разам завітаем да маіх сваякоў у Швецыю. Цяпер Вы не можаце ездзіць па краінах ЕЗ, але, як бачыце, гэта можна папраавіць.*
*Файна ж?*

